Partnership for Good Governance

EUROPEAN UNION

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE

# Вынікі праектаў у Беларусі па праграме «Партнёрства дзеля належнага кіравання» Еўрапейскага Саюза/Савета Еўропы[1]

## Што значыць «Партнёрства дзеля належнага кіравання»?

У красавіку 2014 года Еўрапейскі Саюз і Савет Еўропы дамовіліся аб правядзенні мэтанакіраваных мерапрыемстваў супрацоўніцтва з краінамі Усходняга партнёрства ЕС, каб наблізіць іх да еўрапейскіх стандартаў у сферах правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства права. Праекты ў рамках Партнёрства дзеля належнага кіравання фінансуюцца ў першую чаргу ЕС і сафінансуюцца і рэалізуюцца Саветам Еўропы.

Акрамя 14 рэгіянальных праектаў у Беларусі дзейнічаюць яшчэ **тры спецыфічныя для краіны праекты**, агульны бюджэт якіх складае **200 000 еўра**.

## Правы чалавека для ўсіх

Гэты праект дзейнічае з ліпеня 2017 года па снежань 2017 года.

Чакаецца, што да канца праекта беларускія прадстаўнікі юрыдычных прафесій і супрацоўнікі праваахоўных органаў больш дакладна азнаемяцца з міжнароднымі і еўрапейскімі стандартамі ў галіне правоў чалавека. Трэнінгі па правах чалавека і даведачныя матэрыялы будуць перакладзены на рускую мову і шырока распаўсюджаны.

Акрамя таго, беларускія студэнты, якія вывучаюць права і міжнародныя адносіны, атрымаюць веды аб еўрапейскай сістэме абароны правоў чалавека, уключаючы практыку Еўрапейскага суда па правах чалавека. Метадалогія будзе ахопліваць ўвядзенне курсаў дыстанцыйнага навучання, падрыхтаваных у рамках Еўрапейскай праграмы адукацыі ў галіне правоў чалавека для прадстаўнікоў юрыдычных прафесій (HELP), да навучальных праграм Беларускага дзяржаўнага універсітэта і Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, пракурораў і прадстаўнікоў юрыдычных прафесій на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

[1]Раней вядомыя як праграмы супрацоўніцтва Савета Еўропы/Еўрапейскага Саюза для Арменіі, Азербайджана, Грузіі, Рэспублікі Малдова, Украіны і Беларусі

## Прасоўванне стандартаў Еўрапейскай хартыі рэгіянальных моў або моў меншасцяў у Беларусі

Праект дзейнічае са студзеня 2016 года па снежань 2017 года.

Еўрапейская хартыя рэгіянальных моў або моў меншасцяў (ECRML) накіравана на абарону традыцыйна выкарыстоўваючыхся моў нацыянальных меншасцяў як часткі культурнай спадчыны краіны. Галоўнай мэтай праекта з'яўляецца павышэнне дасведчанасці аб хартыі сярод нацыянальных меншасцяў і аказанне дапамогі ўладам Беларусі ў даследаванні прававых магчымасцяў далучэння краіны да гэтай канвенцыі.

Прадстаўнікі юрыдычных прафесій і прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў у цесным супрацоўніцтве з беларускімі органамі ўлады вылучылі тыя стымулюючыя меры ў хартыі, якія найлепш адаптуюцца да прававой і практычнай сітуацыі ў Беларусі і могуць служыць асновай для далейшага прасоўвання моў меншасцяў у гэтай краіне.

Інфармаванасць аб прасоўванні моў меншасцяў была дасягнутая, у прыватнасці, з мэтай заахвочвання бацькоў да залічэння сваіх дзяцей у школы, дзе вывучаюць мовы меншасцяў..

► Даведачны інфармацыйны ліст аб гэтым праекце даступны на сайце

## Належнае кіраванне і барацьба з карупцыяй

Праект дзейнічае са студзеня 2016 года па снежань 2017 года.

Праект спрыяў павышэнню магчымасцяў нацыянальнага процідзеяння адмыванню грошай і барацьбы з фінансаваннем тэрарызму і паляпшэнню расследавання эканамічных у выніку супрацоўніцтва з пракурорамі, следчымі і дзяржаўнымі службовымі асобамі. 17 устаноў дзяржаўнага сектара развілі разуменне наконт правядзення ацэнкі карупцыйнай рызыкі. А праваахоўныя органы былі навучаны пытанню аб адказнасці юрыдычных асоб, і гэта дазволіла ім ажыццявіць нядаўна ўведзеныя адміністрацыйныя санкцыі.

► Даведачны інфармацыйны ліст аб гэтым праекце даступны на сайце

**Для атрымання дадатковай інфармацыі:** http://pjp-eu.coe.int/en/web/eap-pcf/belarus

**Звязацца:** Нікала Хоўсан, Супрацоўнік па сувязях з грамадскасцю, +33 3 88 41 22 39

**Кастрычнік 2017**